Алеся.  Добры дзень!

Влад. Рады вітаць вас!

Дзіяна. Мы – прадстаўнікі моладзі Капыльскага раёна!

Влад.Капыльшчына – адна з самых маляўнічых,  багатых на гістарычныя падзеі мясцін на нашай зямлі.

Дзіяна. Капыльшчына дала гісторыі выдатных дзеячаў літаратуры, мастацтва і культуры, многія з якіх вядомы нават далёка за межамі Беларусі.

Алеся. Наш зямляк паэт-песеннік  Адам Русак так пісаў аб родным краі:

Верш “Родны край”

Влад. А зараз мы прапануем вам пашырыць  веды пра наш раён.  Але не пад прымусам, а ў гульнёвай форме, нават з доляй азарту - праз разгадванне Капыльскай крыжаванкі.

Дзіяна. Адгадка нават аднаго слова – гэта ўжо поспех.

Крыжаванка

---

- Паэт М. Майсюк пра яе напісаў “Куток дзівосны гнёздаў салаўіных”? (Капыльшчына) Гэта была размінка..)))

1. Існуе легенда “Адкуль Капыль”. Яна апавядае пра тое, што

месца гэтае названа ў памяць аб трагедыі закаханых – дачкі князя і маладога пастуха-музыкі. Назавіце іх імёны  (Коля і Поля — Ко-Поль, а пазнейКапыль)

2. Вам вядома гэта песня, што нарадзілася на Капыльскай зямлі і якую называюць візітоўкай беларусаў. Звычайна яе выконваюць у канцы застолля, калі госці збіраюцца ад’язджаць дадому. (“Бывайце здаровы”)
3. Аўтар песні “Бывайце здаровы”, музыка і паэт-песенні Адам…(Русак)
4. Акім Пятровіч Астрэйка - паэт, перакладчык , аўтар слоў вядомай “Песні пра Нёман”. Але і ў сям’і, і ў літаратурным асяроддзі яго называлі другім імем. Назавіце другое імя Астрэйкі. (Анатоль)
5. У гады вайны гэту кніжку Анатоля Астрэйкі называлі кніжкай-партызанкай. Выдалі яе слуцкія падпольшчыкі ў падпольнай друкарні. Назва кнігі  - “Слуцкі… (пояс)”

6. Аб гэтай рацэ, што цячэ якраз па мяжы Капыльскага і Уздзенскага раёнаў Якуб Колас пісаў: Тут хвалі светлы, срэбналісны, А беражкі - ну, аксамітны. (Нёман)
7. Існуе легенда пра прыгожага і працавітага Нёмана, што карміў людзей, насіў на сабе іх плыты, і яго каханую – прыгажуню-раку, якая толькі ляжала ў цяньку і любавалася сабой ў люстэрка. Назавіце імя прыгажуні-ракі. (Лоша)
8. Ён – класік беларускай літаратуры, аўтар раманаў “Пошукі будучыні” і “Млечны шлях”. Гэта яму належаць словы “Чалавек – гэта цэлы свет”. (Кузьма Чорны)
9. На Капыльшчыне нарадзіўся беларускі пісьменнік, паэт, перакладчык, грамадскі і дзяржаўны дзеячЦішка Гартны, аўтар рамана “Сокі цаліны”. Цішка Гартны - літаратурны псеўданім. Назавіце сапраўднае прозвішча творцы. (Зміцер Жылуновіч)